# Рэдкія і тыповыя біятопы на тэрыторыі Нацыянальнага парка "Браслаўскія азёры "

У 2021 годзе вучонымі з Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі на тэрыторыі нашага нацыянальнага парку праведзена навукова-даследчая работа «Выявіць на тэрыторыі Нацыянальнага парка «Браслаўскія азёры» рэдкія ітыповыя біятопы».

Што ж такое біятопы, і чаму так важна іх даследаваць? Паспрабуем разабрацца.

**Біятоп** - гэта ўчастак зямной паверхні (сушы або вадаёма), з аднатыпнымі ўмовамі асяроддзя (сюды адносяцца рэльеф, глеба, клімат) і населены пэўнай сукупнасцю раслін, жывёл, мікраарганізмаў. Галоўная асаблівасць біятопа складаецца ў тым, што тут працяглы час падтрымліваюцца цалкам устойлівыя ўзаемадзеянні (абмен рэчывам, энергіяй і інфармацыяй) паміж элементамі жывой і нежывой прыроды.

*Рэдкі біятоп* - унікальныя для тэрыторыі краіны ўчасткі, на якіх знойдзены, напрыклад, рэліктавыя (старажытныя) жывёлы і расліны, абоякія валодаюць унікальным рэльефам , складам глебы.

*Тыповы біятоп* - шырока распаўсюджаныя на тэрыторыі краіны ўчасткі і якія ўяўляюць сабой найбольш характэрныя асаблівасці прыроднай зоны, аднак у сувязі з гаспадарчай дзейнасцю маюць схільнасць да хуткай змены або памяншэння плошчы.



**Навошта трэба даследаваць біятопы?** Рэдкія і тыповыя біятопы маюць патрэбу ў ахове - гэта азначае, што на тэрыторыі такіх унікальных месцаў
неабходна забараняць любую гаспадарчую дзейнасць, гэта значыць такую, якая здольная нашкодзіць лесам і азёрам.

Атрыманая ў выніку даследавання інфармацыя аб наяўнасці рэдкіх і тыповых біятопаў можа быць выкарыстана для стварэння новых асабліва ахоўных прыродных тэрыторый (да якіх адносіцца нацыянальныя паркі, заказнікі, запаведнікі, помнікі прыроды). Становіцца магчымым узмацніць ахову асобных прыродных комплексаў на тэрыторыі нашага раёну для таго, каб захаваць біялагічную разнастайнасць тых месцаў, якія маюць у гэтым патрэбу.



<u>Што рабілі вучоныя?</u>

Іх праца складалася *з пяці этапаў :*

1. Адбор участкаў лясных земляў, якія падыходзяць па пэўных крытэрыях да паняццяў "тыповы" і "рэдкі" біятоп. Улічваўся,напрыклад, узрост лесу, якія дрэвы растуць.
2. Абмеркаванне і аналіз абраных участкаў: ці сапраўды іх можна аднесці да рэдкіх ці тыповых.
3. Палявое даследаванне - непасрэдна выезд навукоўцаў на месца размяшчэння біятопу, у лес, яго абследаванне "ў натуры".
4. Апісанне абследаваных біятопаў, запаўненне дакументацыі.
5. Складанне ахоўных дакументаў.

*<u>Ахоўныя дакументы</u> , такія як ахоўныя абавязацельствы , пашпарты, ўключаюць у сябе шэраг абмежаванняў , напрыклад , забараняюць на тэрыторыі*
*рэдкіх і тыповых біятопаў праводзіць рубкі лесу, ажыццяўляць нарыхтоўку раслін, моху, узворванне глебы, выпас жывёлы, размяшчаць турыстычныя стаянкі, праводзіць спартыўныя мерапрыемствы і нават перасоўвацца на аўтамабілі.*

У выніку праведзенага даследавання складзена 33 камплекты ахоўных дакументаў. Каля 3,7% тэрыторыі нацыянальнага парку, а таксама 1,7% тэрыторыі эксперыментальнай лесапаляўнічай гаспадаркі «Браслаў» маюць патрэбу ў ахове і асабліва акуратных адносінах з боку чалавека.

Тыповыя біятопы «Іглічныя лясы на верхавых, пераходных і нізінных балотах, бярозавыя лясы на пераходных балотах», «Лісныя лясы на залішне ўвільготненых глебах і нізінных балотах», «Заходняя тайга», «Яловыя лясы з багатай травяністай раслiннасцю» знаходзяцца пад пагрозай правядзеннем на падобных тэрыторыях рубаклесу, перадачы зямель пад торфаздабычу і іншае.

Рэдкія для нас біятопы "Лясы ў ярах і на стромкіх схілах" сустракаюцца не часта, што служыць яшчэ адной перадумовай для іх узмоцненай.
аховы.
Дзякуючы праведзенаму даследаванню мы можам накіраваць сілы на ахову тых біятопаў, якія ў першую чаргу маюць патрэбу ва ўважлівых адносінах . Аднак не варта забываць аб беражлівым стаўленні да прыроды ў цэлым, толькі разам мы зможам захаваць наш агульны дом для будучыні!



*Матэрыял падрыхтаваў: мл. навуковы супрацоўнік Валошына А.Р.*